# СЕКЦИЯ 1
## ЛИНГВИСТИКА И МЕЖКУЛЬТУРНАЯ КОММУНИКАЦИЯ В СОВРЕМЕННОМ ПОЛИКУЛЬТУРНОМ СОЦИУМЕ

**Т. Бабровіч**
*(Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск, Беларусь)*

### КВАЛІФІКАЦЫЙНАЯ ПРЫКМЕТА Ў АНАМАСІЯЛАГІЧНАЙ СТРУКТУРЫ БІВЕРБАЛЬНЫХ НАЙМЕННЯЎ БУДАЎНІЧАЙ СФЕРЫ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Анамасіялогія (тэорыя намінацыі) складае важную частку даследаванняў у сучаснай лінгвістыцы. Прадметам тэорыі намінацыі з'яўляецца выяўленне і аналіз заканамернасцей утварэння намінатыўных адзінак, вывучэнне ўзаемасувязі паміж паняційнымі формамі мыслення, а таксама тое, якім чынам утвараюцца і замацоўваюцца найменні за рознымі фрагментамі аб'ектыўнай рэальнасці, так званую моўную тэхніку намінацыі: яе акты, сродкі і спосабы.

Як асобны раздзел мовазнаўства анамасіялогія вылучылася ў пяцідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Па словах А.С. Кубраковай, "чэшскія лінгвісты былі першымі вучонымі, якія звярнулі ўвагу на складаны характар вытворнага слова і яго абавязковую двучленнасць: анамасіялагаічны базіс і анамасіялагічную прыкмету" [7, с. 46]. Працэс называння, які з'яўляецца прадметам тэорыі намінацыі, уяўляе сабой комплексны мыслёвы і маўленчы працэс, у якім выдзяляюць некалькі этапаў: этап вычлянення свядомасцю аб'екта, які трэба назваць, асмысленне таго, што трэба абазначыць, і выбар адэкватных моўных сродкаў наймення. У сувязі з гэтым, пэўную цікавасць уяўляюць вытворныя адзінкі, у якіх магчыма ўстанавіць анамасіялагічную структуру. Анамасіялагічны аналіз намінацый дазваляе зафіксаваць асаблівасці намінатыўнай дзейнасці чалавека. Як паказваюць назіранні, такі аналіз прымянімы да вытворных універбаў (аднаслоўных найменняў), якія ўтвораны рознымі спосабамі, бівербальных і полівербальных найменняў.

Традыцыйна пры анамасіялагічным падыходзе за аснову бярэцца паняцце і вызначаецца, па-першае, якія найменні існуюць у мове для гэтага паняцця і, па-другое, якія сувязі паміж паняццем, назвай і абазначаемым прадметам. Названы аналіз эфектыўна праводзіць з вызначэннем тыпаў намінатыўных адзінак. Вядома, што ў мовазнаўстве паняцці "тып" і "тыпалогія" ўжываюцца ў розных значэннях. Паводле меркавання У.Р. Гака, "тып" вызначаецца як "мадэль (узор), якому адпавядае акрэсленая група розных з'яў" [3, с. 310]. Такімі з'явамі могуць выступаць моўныя адзінкі. Аналіз уласцівасцей і асаблівасцей функцыянавання прыводзіць да магчымасці групоўкі, выдзяленню катэгорый, класаў такіх адзінак, а значыць да ўстанаўлення іх тыпаў.

Тэрмін "тыпалогія" можна вызначыць як "выяўленне і ўпарадкаванне розных тыпаў існавання аб'екта" [3, с. 328]. На думку Т.Р. Трафімовіч,

*тыпалогія* – гэта яшчэ і навуковы метад, які прымяняецца пры аналізе моўных фактаў і з'яў, паколькі валодае значнай тлумачальнай здольнасцю. Даследчык падкрэслівае, што з яго дапамогай магчыма выявіць анталагічныя ўласцівасці аб'ектаў, якія вывучаюцца, на аснове пэўных крытэрыяў вызначыць іх групы (тыпы) і вылучыць заканамернасці сістэмнай арганізацыі той ці іншай часткі мовы [11, с. 2].

Неабходна адзначыць, што разам з паняццем "тып намінацыі" ў сучаснай анамасіялогіі ўжываюцца тэрміны "прынцып намінацыі", "тыпы матываваных прыкмет". М.Д. Голеў у выніку аналізу даследаванняў па анамасіялогіі прыходзіць да высновы, што розныя тэрміны абазначаюць адну і тую ж лінгвістычную з'яву – своеасаблівыя анамасіялагічныя мадэлі з абагульненнем найбольш характэрных аспектаў і прыкметы, па якіх адбываецца намінацыя аднародных прадметаў [5, с. 17].

Пры выяўленні тыпаў найменняў важным з'яўляецца выдзяленне іх анамасіялагічнага базісу і анамасіялагічнай прыкметы. На думку У.Р. Гака, любы прадмет "характарызуецца мноствам прыкмет, уласцівасцей, адносін, іх немагчыма, ды практычна і не трэба выдзяляць усе ў працэсе намінацыі, і прадмет называецца па якой-небудзь адной або некалькіх яскравых прыкметах, якія рэпрэзентуюць увесь прадмет" [4, с. 20]. Калі анамасіялагічны базіс, які вызначае катэгарыяльную прыналежнасць наймення, заўсёды характарызуецца простай структурай, то анамасіялагічная прыкмета мае розную ступень ускладненасці. Так, паводле даследаванняў Т.Р. Трафімовіч, пад увагай знаходзіцца семантычная структуралізацыя паняцця, якая дае магчымасць прасачыць ход узнікнення вытворнага наймення ад больш высокіх да больш нізкіх узроўняў абстракцыі [11]. У сувязі з гэтым у якасці тыпалагізаванага параметра для пабудовы класіфікацыі тыпаў найменняў можа выступаць характар анамасіялагічнай прыкметы. Прадуктыўнасць тыпаў намінацыі і іх іерархія дазваляюць зрабіць вывад аб тым, якія паняцці пры выяўленні анамасіялагічнай прыкметы з'явіліся найбольш значнымі і прадуктыўнымі і як яны звязаны з універсальнымі канцэптуальнымі ўяўленнямі чалавека. Вылучыць анамасіялагічную прыкмету магчыма для кожнага аднаслоўнага вытворнага і бівербальнага наймення шляхам узнаўлення намінатыўнага суджэння. Так, Т.Р. Трафімовіч у працы, прысвечанай старарускай прадметнай намінацыі, выдзяляе як найбольш тыповыя *агентыўную, аб'ектную, лакатыўную, пасесіўную* і *нумеральна-тэмпаральную* прыкметы [11, с. 50]. Н.А. Дзерунова вылучае ў сваім даследаванні яшчэ і *кваліфікацыйны тып* [6].

Для аналізу былі ўзяты субстантыўныя бівербальныя найменні будаўнічай сферы, якія ўваходзяць у тэматычныя падгрупы "Будаўнічыя матэрыялы і рэчывы", "Будынкі, памяшканні", "Будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы". Крыніцай эмпірычнага матэрыялу сталі пяцітомны "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" [10], двухтомны "Русско-белорусский политехнический словарь" [8], "Современный русско-белорусский политехнический словарь" [1], "Русско-белорусский словарь по основамстроительного дела" [9], а таксама асобныя выданні, прысвечаныя будаўніцтву. Намі было прааналізавана больш за 2000 бівербальных найменняў, сярод якіх вылучана 394 бівербальныя адзінкі кваліфікацыйнага тыпу.

Кожны аб’ект валодае шэрагам прыкмет, адзін з якіх кладзецца ў аснову пры яго называнні. Часам бывае цяжка вызначыць сутнасць наймення, устанавіць яго прыналежнасць да канкрэтнага тыпу. Часцей за ўсё гэта адбываецца ў найменнях, дзе ў аснову намінацыі закладзены кваліфікацыйныя прыкметы, а якасць ці ўласцівасць анамасіялагічнай прыкметы выражаецца непасрэдна значэннем асновы слова-прыкметы. Аб гэтым даволі падрабязна пісаў В.У. Вінаградаў. Ён прапанаваў вылучыць групы прыметнікаў, якія называюць колер, прасторавыя і часавыя якасці, знешнія і фізічныя ўласцівасці, унутраныя якасці і г.д. [2, с. 153]. Па словах Н.А. Дзеруновай, “кваліфікацыйнымі можна лічыць прыкметы, якія характарызуюць прадметы праз аднясенне іх да якіх-небудзь груп, не аб’яднаных паняццем дзеяння, месца, аб’екта і іншых тыповых для разгледжаных найменняў прыкмет” [6, с. 102]. Да кваліфікацыйнага тыпу адносяцца адзінкі, якія ў сваёй унутранай форме актуалізуюць інфармацыю аб фізічных якасцях аб’екта намінацыі. На думку Г.Н. Ягафаравай, можна выдзеліць два тыпы матываў, у якіх у аснове намінацыі змяшчаецца кваліфікацыйная прыкмета:

1) знешні выгляд аб’екта, г. зн. тое, што ўспрымаецца зрокам, дотыкам, а значыць важнымі аказваюцца ў працэсе намінацыі колер, форма, памер, велічыня, структура, фізічныя якасці і і інш.;

2) унутраныя якасці аб’екта, тое, што можна адчуваць праз органы пачуццяў, а значыць, важнымі аказваюцца пры намінацыі пах, смак, характар, манера паводзіні інш. [12, с. 33].

Так, будаўнічыя тэрміны кваліфікацыйнага тыпу вылучаны ва ўсіх прааналізаваных тэматычных падгрупах і прадстаўлены сінтаксічнымі дэрыватамі. Невялікую групу складаюць бівербы тэматычнай падгрупы “Будаўнічыя матэрыялы, рэчывы”, у якіх атрыбутыўны кампанент указвае на колер: *партландцэмент **белы**, партландцэмент **каляровы***; *эмаль **белая***; *бляха **чорная***; *вапняк **белы***; *лінолеум **шматколерны***. У дадзенай тэматычнай падгрупе шырока прадстаўлены бівербальныя найменні з атрыбутыўным кампанентам, які ўказвае на фізічныя якасці ці структуру матэрыялаў і рэчываў: *алюміній **грануляваны***; *бетон **порысты**, бетон **ячэісты**, бетон **слаісты**, бетон **лёгкі***; *бітум **вязкі**, бітум **рэдкі**, бітум **мяккі***; *валакно **цвёрдае**, валакно **эластычнае**, валакно **тастаўсценнае***; *гіпс **валакністы***; *драўніна **буйнаслойная**, драўніна **вузкаслойная***; *мармур **жылкаваты***; *пенапласт **мяккі**, пенапласт **эластычны***; *парапласты **гібкія**, парапласты **цвёрдыя***; *плітка **порыстая***; *пластык **валакністы**, пластык **ячэісты***; *запаўняльнік **актыўны**, запаўняльнік **порысты**, запаўняльнік **цвёрды***; *пігмент **непразрысты***.

У тэрміналагічных словазлучэннях, якія ўваходзяць у тэматычныя падгрупы “Будынкі, памяшканні”, “Будаўнічыя канструкцыі, часткі, элементы” прыметнік указвае на форму ці памер аб’екта: *арка **кругавая**, арка **паўцыркульная**, арка **рашотчатая**, арка **скразная***; *арматура **стрыжнёвая***; *дзверы **пустацелыя***; *дом **вышынны**, дом **тыпавы***; *перакрыцце **плоскае**, перакрыцце **рабрыстае***; *сцяна **ажурная***; *падмурак **плоскі***; *градзірня **секцыйная***; *купал **стральчаты***.

Бівербальныя найменні кваліфікацыйнага тыпу ўтвараюцца ў выніку *семантычнай дэрывацыі*, калі адбываецца пераасэнсаванне атрыбутыўнага

кампанента. Напрыклад, *падлога* ***чорная*** (асаблівасці канструкцыі падлогі), *падлога* ***чыставая*** (асаблівасці канструкцыі падлогі); *дзверы* ***глухія*** (у якіх адсутнічаюць дэкаратыўныя элементы); *акно* ***глухое*** (акно, зробленае для формы, а не для карыстання); *сцяна* ***глухая*** (суцэльная сцяна без акон і дзвярэй); *бетон* ***тлусты*** (змяшчае вялікі працэнт цэменту ў сваёй структуры), *бетон* ***бедны*** (змяшчае нізкі працэнт цэменту ў сваёй структуры); *вапна* ***бедная*** (змяшчае ў сваёй структуры малы працэнт прымесей), *латэкс* ***кіслы*** (указвае на асаблівасці ў структуры) і інш.

Такім чынам, даследаванне тыпаў намінацыі адзінак будаўнічай сферы адыгрывае важную ролю, паколькі пры супадзенні ва ўсіх народаў найбольш важных уяўленняў аб прадметах і з’явах навакольнага асяроддзя працэс называння адбываецца па-рознаму. Анамасіялагічны падыход пры вывучэнні моўных адзінак дазволіў вылучыць у структуры біވербальных будаўнічых найменняў анамасіялагічны базіс і анамасіялагічную прыкмету. Паводле характару анамасіялагічнай прыкметы сярод моўных адзінак былі выдзелены біверб кваліфікацыйнага тыпу, у якіх кваліфікацыйная прыкмета актуалізуе інфармацыю аб фізічных якасцях аб’екта намінацыі.

**Літаратура**


1. Булыко, А. Н. Современный русско-белорусский политехнический словарь / А.Н. Булыко (авт.-сост.). – Мн. : Харвест, 2007. – 432 с.

2. Виноград, В.В. Русский язык: Грамматическое учение о слове / В.В. Виноградов. − М. : Высшая школа, 1972. − 614 с.

3. Гак, В. Г. Языковые преобразования / В. Г. Гак. – М. : Шк. «Языки рус. культуры», 1998. –768 с.

4. Гак, В.Г. К проблеме соотношения языка и действительности / В.Г. Гак // Язык и действительность : сборник научных трудов памяти В.Г. Гака / редкол.: С.Г. Тер-Минасова (председатель) [и др.]. – Москва : URSS : Ленанд, 2007. – С. 16–26.

5. Голев, Н. Д. О некоторых общих особенностях принципов номинации в диалектной лексике флоры и фауны / Н.Д. Голев // Русские говоры Сибири. – Томск : Изд-во ТГУ, 1981. − С. 17–21.

6. Дерунова, А.А. Названия документов в русском деловом языке XI–XVII вв.: становление и развитие номинативной категории, типы наименований: дис. ... канд. филол. наук: 10.02.01 / А.А. Дерунова. −Минск, 2015. − 130 с.

7. Кубрякова, Е.С. Теория номинации и словообразования / Е.С. Кубрякова Изд. 3-е. – М. : URSS : Либроком, 2012. – 83 с.

8. Русско-белорусский политехнический словарь : в 2 т. / И. Л. Бурак (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1997–1998. – 2 т.

9. Русско-белорусский словарь по основам строительного дела / П. С. Бобарыко (авт.-сост). – Минск : БГТУ, 1994. – 20 с.

10. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа ; рэдкал.: А. А. Атраховіч (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1977–1984. – 5 т.

11. Трофимович, Т. Г. Типы предметных наименований в языке старорусской деловой письменности : монография / Т. Г.Трофимович. – Минск : БГПУ, 2003. – 223 с.

12. Ягафарова, Г. Н. Ономасиологический анализ лексики современногобашкирского языка : автореф. дис. … д-ра фил. наук : 10.02.02 / Г. Н. Ягафарова; Рос. акад. наук, Ин-т ист., яз. и лит. – Казань, 2018. – 52 с.